«НАШАЕ ЖЫЦЬЦЁ» — грамадзкая газэта

# НАША ЖИЗНЬ

«НАША ЖИЗНЬ» — общественная газета

№9(22) октябрь 2011

# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ “ПРАЕКТА АЛЕСЯ ПУШКІНА”

Грамадскія актывісты Верхнядзвіншчыны апошняе паўгоддзе скіроўваюць свае высілкі на арганізацыю сустрэч з вядомымі на Беларусі дзеячамі культуры: пісьменнікамі і паэтамі, гісторыкамі, мастакамі. Кіраўніца незарэгістраванай жаночай арганізацыі “ІніцыЯ+ТЫва”, старшыня Верхнядзвінскай раённай арганізацыі БСДП **Валянціна Болбат** тлумачыць, што “…неабходнасць гэтай дзейнасці абумоўлена тым, што жыццё ў невялікіх правінцыйных гарадках, дзе няма шырокага доступу да незалежных сродкаў масавай інфармацыі, дзе абмежавана магчымасць зносін з прадстаўнікамі нацыянальнай эліты, інтэрнету, дзе дастаткова жорстка абмяжоўваецца магчымасць усялякага вальнадумства, а дзейнасць ідэалагічных структур мясцовых органаў улады ўпісваецца толькі у рамкі дазволенага”. Яна лічыць, што “…такія сустрэчы будут садзейнічаць развіццю і актывізацыі грамадска-культурнага і палітычнага жыцця ў рэгіёне, запоўняць той вакуум у інфармацыі, які існуе на сёння.”

І чарговая імпрэза з **Алесем Пушкіным** - з шэрагу такіх мерапрыемстваў, на якой ён прэзентаваў ”Праект Алеся Пушкіна”, сутнасць якога ў тым, каб агульнымі намаганнямі, і прапануе гэта зрабіць на прыкладзе мястэчка Бобр, дзе ён жыве, мясцовых уладаў, грамадзян, грамадска-актыўных людзей зрабіць мясціны нашага пражывання больш прыгожымі і годнымі для жыцця.

“Мерапрыемствы падобнага кшталту — гэта магчымасць праз аўтарытэт вядомых грамадскіх




дзеячоў узняць інтарэс да беларускай культуры, мовы, гісторыі нашай краіны, пачуць кампетэнтнае меркаванне аб падзеях, што адбываюцца ў межах Беларусі, а таксама па важных старонках гісторыі, культуры, эканамічнага жыцця. Акрамя таго, такія сустрэчы будуць спрыяць і падвышэнню аўтарытэта мясцовых грамадска-палітычных арганізацый, іх пазнавальнасці для мясцовага насельніцтва, стварэнні пазітыўнага іміджу” - дадае Валянціна Болбат.

# ВІНШУЕМ З ПЕРШЫМ ЗБОРНІКАМ!

Сярод літаратараў Верхнедзвіншчыны з’явілася яшчэ адно выбітнае імя. Аўтарам кнігі-эсэ “Аблічча лёсу” (“Лики судьбы”) стаў **Пётр Квяцінскі.**




Працуючы сельскім доктарам, Пётр Пятровіч пазнаёміўся з многімі людзьмі незвычайных лёсаў, выслухаў нямала расказаў-споведзяў, якія захоўваў у сваёй учэпістай памяці і падчас заносіў у дзённікі-блакноты. Урэшце яны пачалі настойліва “прасіцца ў людзі”, і доктар узяўся за пяро. Свае эсэ ён піша хутка, нанізваючы на сапраўдныя сюжэты аўтарскія маральна-філасофскія роздумы. Пісьменніку-пачаткоўцу цікавыя само жыццё, людзі як характары, тыпажы і лёсы.

Адна з першых разгорнутых прэзентацый кнігі прайшла ў “штаб-кватэры” народнага клуба “Белыя вароны”. А пасьля такую ж імпрэзу зладзілі сябры “Клуба цікавых сустрэч”.

Віншуючы Пятра Квяцінскага, некалі актыўнага сябра партыі БСДП “Грамада”, Валянціна Болбат, кіраўніца раеннай арганізацыі, уручыла яму віншавальны падарунак ад грамадскіх актывістаў раёну і пажадала плёну і далейшай творчай працы.

# ШТО РОБЯЦЬ З БЕЛАРУСКІМ НАРОДАМ…

Чаму масавая незадаволенасць не ператвараецца ў беларускім грамадзтве ў масавы пратэст? З такім пытаньнем мы звярнуліся да кіраўніка сацыялягічнай лябараторыі НОВАК, прафэсара **Андрэя Вардамацкага.** У адказ ён прапанаваў цытату з адной са справаздачаў лябараторыі і 8 тэзісаў.

«Калі б аўтары Кама-Сутры ўбачылі, што робяць з беларускім народам — з яго згоды — яны б назвалі сябе дзецьмі, якія гуляюць у пясочніцы».

1. Адсутнасць сацыяльнага досведу жыцця ва ўмовах дэмакратыі;

2. Беларусь найбольш інтэнсіўна дэлегавала найлепшыя кадры ў Маскву — ўсесаюзны вяршказдымальны апарат;

3. Самае сумнае наступства 2-й сусветнай вайны — не забойства мільёнаў, самае сумнае — забіты нацыянальны характар;

4. Супярэчнасць паміж узроўнем прафэсійнай кваліфікацыі і ўзроўнем грамадзянскай актыўнасці і свядомасці — галоўная рыса беларускай масавай свядомасці;

5. Беларусь — зборачны цэх СССР. Ён заўсёды загружаны — таму патрэбная прафэсійная кваліфікацыя, а не прадпрымальнасць;

6. Разбурэнне Лукашэнкам грамадзянскай супольнасці у РБ мае больш інтэнсіўны характар, чым было ў СССР;

7. Адбылося разбурэнне сацыяльнага кантракту;

8. Беларускі сацыяльны кантракт цяпер — кантракт паміж канваірам і вязнем.

*09.10.2011 Радыё Свабода*

# У ГЭТЫ ДОМ ХОЧАЦЦА ПРЫХОДЗІЦЬ

Гэтая гасцінная сядзіба на адной з ціхіх вулачак Верхнядзвінска – гарадская адметнасць: мора рознакаляровых кветак бушуе тут з ранняй вясны і да позняй восені. А варта толькі прыадчыніць весьнічкі і ўвайсці ва двор, разумееш адразу: тут жывуць незвычайныя людзі. Гаспадары ўсяго гэтага багацця па завулку Скарыны – **Яўгенія Мікітаўна і Мікалай Пятровіч Дароўкі.**

І наша чарговая імпрэза – магчымасць сустрэцца з людзьмі,якія пражылі ў згодзе і каханні 45 гадоў. А асаблівая адметнасць гэтага дома – яго гасціннасць: тут любяць прымаць гасцей, любяць пачаставаць іх тым, што самі вырасцілі на ўласным агародзе. Памідоры ў гэтым годзе амаль па кілаграму, урадзіў вінаград, для якога старанны гаспадар Мікалай Пятровіч зрабіў цяпліцу і частуе сяброў новым ураджаем ужо напрыканцы чэрвеня. Яблыні, слівы,ігрушы… і мора кветак. А гэта ўжо клопат Яўгеніі Мікітаўны.

– Вось так і прымяняю свае веды, што столькі гадоў таму набыла ў Ленінградскай лесатэхнічнай акадэміі. А размеркаванне мела аж у горад Сочы. Не збылося, але не шкадую, бо знайшла сваё шчасце тут. А чым нашы кветкавыя паляны горшыя за сочынскія?, – гаворыць Яўгенія Мікітаўна.

Пагаджаемся: ”Не саступаюць”. І ведаем, што не адзін раз гэтая сядзіба была пераможцай раённых аглядаў-конкурсаў па добраўпарадкаванні



прысядзібных тэрыторый.

Шмат гадоў таму маладзенькай студэнтцы захацелася рабіны… Прыгожую ветку з буйнымі чырвонымі пладамі для яе дастаў Мікалай Пятровіч.

# НА НАРОДНЫМ СХОДЗЕ - “КАМУНАЛЬНЫЯ” ПЫТАНЬНІ

Віцебскіх чыноўнікаў на Народным сходзе чакаюць “камунальныя” пытаньні.

Ініцыятары Народнага сходу занесьлі запрашэньне ў Віцебскі гарвыканкам. Імпрэзу мяркуюць правесьці не на плошчы ў цэнтры гораду, а ў звычайным віцебскім двары, дзе ў звычайных гараджанаў ёсьць шмат пытаньняў да чыноўнікаў.

“Калі мы з **Тацянай Севярынец** панесьлі запрашэньне у выканкам, нас доўга “шпынялі” па кабінэтах. Спачатку накіравалі ў аддзел, які займаецца зваротамі грамадзянаў, але там, аказваецца пісьмовыя звароты не рэгіструюцца – проста складаюцца, дый усё. Потым нам параілі ісьці яшчэ ў нейкі кабінэт, але мы вырашылі зьвярнуцца наўпрост у прыёмную: для нас было істотна, каб запрашэньне было афіцыйна зарэгістравалі, і каб яно абавязкова трапіла да кіраўнічага складу гарвыканкаму”, — патлумачыла **Ірына Яскевіч**, кіраўніца абласнога аргкамітэту па правядзеньні Народнага сходу.

Арганізатары запрашаюць жыхароў Віцебску сабрацца 8 кастрычніка ў двары дамоў №2 і №4 па вуліцы Багдана Хмяльніцкага. Гэта амаль у самым цэнтры гораду, недалёка ад плошчы Свабоды. Тут мясцовыя жыхары пакутуюць на дробныя праблемы: да прыкладу у двары часам утвараецца несанкцыянаваная паркоўка для аўтамабіляў – калі на бліжэйшых аўтастаянках бракуе месца для машын. Яшчэ адно пытаньне – гэта вялікая яміна ў двары, ужо да паловы занесеная апалым восеньскім лісьцем.

*05.10.2011 Радыё Свабода*

**«НАША ЖИЗНЬ»** - общественная газета. Издатель - коллектив редакции. Выходит нерегулярно. Тираж 299 экземпляров. Редактор - **Христафор Желяпов.** Вёрстка - **Сергей Солидный.** Напечатана на частном оборудовании на свои средства и с помощью единомышленников.

# МАЛЕНЬКАЯ ПЕРАМОГА

Віцебскі ўдзельнік акцыі маўклівага пратэсту здолеў дамагчыся адмены пакараньня.

**Аляксандар Бажкоў**, затрыманы сёлета 6 ліпеня на плошчы Перамогі ў Віцебску, быў пакараны штрафам памерам 70 тысяч рублёў за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі. Пасьля скаргі ў абласны суд ягоную справу накіравалі на перагляд, і хлопца прызналі невінаватым — адзінага з 15 затрыманых у той дзень пратэстоўцаў.

Зрэшты, толькі чацьвёра удзельнікаў акцыі з 15 пакараных штрафамі вырашылі абскарджваць пастановы судзьдзі Кастрычніцкага райсуду **Іны Грабоўскай**.

«Штрафы многім падаліся невялікімі: дзяўчат штрафавалі на адну базавую велічыню, а хлопцаў — на дзьве. Але скаргі **Ўсевалада Жураўлёва**, **Уладзімера Мацьвеева** і **Ульляны Хлашчанковай** судзьдзя абласнога суду **Ірына Смалякова** не задаволіла. На перагляд была накіравана толькі справа Аляксандра Бажкова», — расказаў юрыст **Аляксей Гаўруцікаў**, які дапамагаў хлопцу складаць зварот у абласны суд.

На новым судовым пасяджэньні судзьдзя Кастрычніцкага райсуду **Эдгар Марцірасян** спыніў адміністрацыйную справу Аляксандра Бажкова, прызнаўшы яго невінаватым.

Гэта адзіны выпадак у Віцебску, калі затрыманага за ўдзел у акцыях маўклівага пратэсту апраўдалі: пасьля шэрагу затрыманьняў падчас некалькіх акцыяў, якія праходзілі гэтым летам, удзельнікаў неаднаразова каралі штрафам рознага памеру, і аспрэчыць рашэньне суду, як правіла, не ўдавалася.

*04.10.2011 Радыё Свабода*

# ДНЮ МАЦІ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Каля трох дзесяткаў удзельнікаў імпрэзы , а гэта вядомыя ў горадзе жанчыны, - **Валянціна Аляксандраўна Радзіёнава**, маці трох сыноў, настаўніца малявання СШ№1, якая дала пуцёўку ў вялікае мастацтва не аднаму выпускніку школы, урач – жыццялюб **Людміла Самадумская**, вышываныя карціны якой прыводзяць у захапленне, **Валянціна Мінаеўна Мядзюта** – гаспадыня ад Бога, **Гагалінская Людміла Васільеўна** — краязнавец, гаспадыня прыватнага музея самавараў. Пра кожную з жанчын, што прысутнічалі на сустрэчы, можна расказваць бясконца... І, канешне, гераіняй імпрэзы была **Яўгенія Міхайлаўна Багушэвіч** і яе сын Вячаслаў, загадчык аддзела фізічнай культуры і спорту райвыканкама.



Расказвае Валянціна Болбат:

– Ладзілася гэта імпрэза, канешне, з нагоды Дня Маці. А гераіняй сустрэчы невыпадкова стала Яўгенія Міхайлаўна Багушэвіч, якая вырасціла двух добрых сыноў, для якіх заўсёды і ва ўсім была прыкладам, як і для шматлікіх вучняў тых школ, дзе ей давялося працаваць настаўніцай. Сціплая, стрыманая, інтэлігентная, такімі выхавала яна і сваіх дзяцей. А Вячаслаў, як яна кажа, стаў сямейнай “зоркай”.

– Але не толькі сямейнай,– дадае дырэктар цэнралізаванай бібліятэчнай сістэмы раена **Ала Канстанцінаўна Гендзік**. Зоркай рэспубліканскага масштабу, бо Вячаславу пашчасціла быць удзельнікам, спачатку абласной, а потым і рэспубліканскай каманд ў праекце АНТ “Бітва цітанаў”. І усе жыхары раёна з захапленнемназіравалі за тым, як разгортваліся падзеі ў далёкім французскім горадзе і, канешне, “балелі за нашых”.

Расказвае Вячаслаў Багушэвіч:

– Увогуле, усё атрымалася выпадкова, хаця спачатку я рыхтаваў дакументы для кастынгу і ўдзелу ў праекце. Але абставіны склаліся так, што я змог толькі пакінуць неабходныя паперы камісіі і, на мой погляд, шанцаў у мяне не было, бо на кастынг прыйшло больш за сотню чалавек, а адабраць патрэбна было 13. Пакінуў дакументы і паехаў з Віцебску дахаты. А калі патэлефанавалі і паведамілі, што я прыняты ў каманду, я спачатку нават не паверыў. Цяжка, канешне, было, але і уражанняў – на усё жыццё.

Кожная маці шчаслівая тады, калі шчаслівыя яе дзеці. Са святам дарагія, матулі!

## ІНФАРМАЦЫЯ

Увага!

У Віцебску працуе Еўрапейскі Інфармацыйны цэнтр. Жыхары горада могуць атрымаць неабходную інфармацыю пра Еўразьвяз і дзейнасьць інстытутаў ЕЗ кожныя чацьвер з 15.00 да 19.00, суботу з 12.00 да 18.00, нядзелю з 11.00 да 17.00. Запрашаем на вул.1-ю Сенненскую, д.5. Кантактны тэл. 27-23-39

# ПРЭЗЭНТАЦЫЯ ЗБОРНІКА “АД НІЎ ПРЫДЗВІНСКІХ”



Напярэдадні свята беларускай пісьменнасці і друку грамадскія актывісты і сябры Беларускай сацыял-дэмакртычнай партыі правялі чарговую імпрэзу з выдатнымі літаратурнымі творцамі - сябрамі абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў **Францам Сіўко** і паэткай-бардам **Лерай Сом.** На імпрэзу прыйшлі не толькі аматары мастацкага слова - гараджане, для якіх чаканыя госці з’яўляюцца ўжо даўнімі сябрамі. Паслухаць жывое слова знаных майстроў пяра і паўдзельнічаць у гутарцы пра сучасныя праблемы літаратуры і грамадскага жыцця прыехалі на роварах і сябры народнага клуба “Белыя вароны” з Каханавічаў.

Франц Сіўко распавёў пра свае творчыя набыткі і планы, прэзэнтаваў паэтычны зборнік “Ад ніў прыдзвінскіх”, у які ўвайшлі і вершы верхнядзвінскіх паэтаў, а таксама прачытаў некалькі сваіх твораў, адказаў на пытанні прысутных. Лера Сом на гэты раз была без гітары, але і без шасціструннай сяброўкі была на хвалі жывой увагі слухачоў. З мясцовых найбольш актыўнымі выступоўцамі былі гаспадыня “Рубону” **Валянціна Болбат**, яна ж арганізатар імпрэзы, паэт **Антон Бубала** і лідар “белых воронаў” **Пётр Квяцінскі**, які дэбютаваў у новай якасці - пісьменніка, аўтара кнігі - зборніка эсэ “Лики судьбы”.

Стараннямі сяброўак з грамадскіх арганізацый была створана ўтульная атмасфера. Падагрэтыя гарбатай ды кавай, удзельнікі сустрэчы доўжылі гутарку ў кулуарах. Франц трапіў у абдымкі колішняй каляжанкі па працы ў СШ № 2, настаўніцы, якую вельмі любілі вучні, а цяперашняй пенсіянеркі **Галіны Іванаўны Ахламёнак**, а Лера апынулася ў коле сяброўак, якіх цікавіла тэма сямейнага жыцця ды жаночай долі і ролі жанчыны ў грамадстве. Валянціна Болбат прапанавала прагляд запісаных на кампутары матэрыялаў аб дзейнасці суполак інфармацыйна-рэсурсовага цэнтру “Рубон”. Развіталіся з сяброўскімі зычэннямі на здароўе ды шчасце і шчырым жаданем новых сустрэч.

Паэтычны зборнік “Ад ніў прыдзвінскіх” быў уручаны дырэктару цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы раёна **Але Гендзік** (на фота).

# ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПРАЕКТУ “ПРАГРАМА 40+...”

Удзельнікамі прэзентацыі “Праграмы 40+…” сталі прадстаўнікі грамадскіх аб’яднанняў з Полацку і Наваполацку, Віцебску і Оршы, Верхнядзвінску і Паставаў… 25 грамадскіх актывістаў прынялі ўдзел у абмеркаванні праблемы, якая тычыцца не толькі жанчын - захворвання на рак малочнай залозы. Падчас прэзентацыі выступіла урач, кіраўнік незарэгістраванага бацькоўскага аб’яднання “Дрэва жыцця” **Таццяна Сідарэнка**, сукаардынатар праекту па Віцебскай вобласці **Алена Фаміна**. Вяла прэзентацыю Валянціна Болбат: “Да гэтай прэзентацыі мы падрыхтавалі дастатковую колькасць рознага матэрыялу па гэтай праблеме. І, безумоўна, фільмы з удзелам галоўнага мамолага краіны, доктара медыцынскіх навук, прафесара Леаніда Путырскага — выключныя па свайму ўздзеянню матэрыялы.”



Удзельнікі прэзентацыі выказалі шэраг каштоўных прапаноў не толькі аб тым, што патрэбна рабіць у напрамку больш эфектыўнай інфармацыйнай працы па праблеме раку малочнай залозы, але і увогуле па тых фактарах, якія адмоўна ўплываюць на здароўе чалавека: няпростай экалагічнай абстаноўцы, зніжэнні вартасці маральных каштоўнасцяў у грамадстве, а таксама больш шырока супрацоўніцтва з органамі ўлады і медыцынскімі работнікамі, змякчэння беларускага заканадаўства адносна дзейнасці грамадскага сектару.

Другая частка сустрэчы, як назвалі яе ўдзельнікі, была “для душы”: экскурсія па Дому рамёстваў і нацыянальных культур, дзе размешчаны выставы работ Нінелі Счаснай, вядомага полацкага фотамайстра Эрнэста Цецярэўскага, разьбяра па дрэву Валянціна Нагорнага.

Прызнаны агульнавядомы факт — добрыя эмоцыі уплываюць не толькі на настрой чалавека, але і яго здароўе.